01.05.2024 / / СЕРАДА / / 8 ВЫПУСК

# ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

**ВУЧЭННЕ — ТОЛЬКІ СВЯТЛО, ПА НАРОДНАЙ ПРЫМАЎЦЫ, — ЯНО ТАКСАМА І СВАБОДА. НІШТО ТАК НЕ ВЫЗВАЛЯЕ ЧАЛАВЕКА, ЯК ВЕДЫ…** ***І. ТУРГЕНЕЎ***



## 2 КРАСАВІКА – ДЗЕНЬ РАСПАЎСЮДЖВАННЯ ІНФАРМАЦЫІ АБ ПРАБЛЕМЕ АЎТЫЗМУ

## ЧЛЕНЫ КЛУБА РЭДАКТАРАЎ ДЗЯРЖЫНСКАГА РАЁНА НАВЕДАЛІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ



**Працаўнікі Купалаўскага тэатра з цеплынёй сустрэлі членаў клуба рэдактараў Дзяржынскага раёна ў сваім храме мастацтва.**




## 2 КРАСАВІКА – ДЗЕНЬ ЯДНАННЯ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Дружба Беларусі і Расіі сёння моцная як ніколі. Больш за чвэрць стагоддзя дзве краіны, Беларусь і Расія, дэманструюць усяму свету прыклад згуртаванасці і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.




## 12 КРАСАВІКА – МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ВЫХАДУ ЧАЛАВЕКА Ў КОСМАС

*У ГЭТЫМ ВЫПУСКУ*


| ДЗЕНЬ ЯДНАННЯ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ | МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ВЫХАДУ ЧАЛАВЕКА Ў КОСМАС | КЛУБ РЭДАКТАРАЎ ДЗЯРЖЫНСКАГА РАЁНА |
|---|---|---|

ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

ШТО Ж ТАКОЕ ТЭАТР? О, ГЭТА САПРАЎДНЫ ХРАМ МАСТАЦТВА! *В. БЯЛІНСКІ*

# Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы запрашае гледачоў

**ЛЕАНЕЦ АНАСТАСІЯ**



Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы – найстарэйшы прафесійны



тэатр у Беларусі, галоўная драматычная пляцоўка краіны. Заснаваны ў верасні 1920 года намаганнямі першага мастацкага кіраўніка Фларыяна Ждановіча.

Купалаўскі тэатр доўгі час паспяхова захоўвае найлепшыя дасягненні айчыннага тэатральнага мастацтва. Яго пастаноўкі спалучаюць традыцыйныя каштоўнасці і творчы эксперымент.



**Прадстаўнікі клуба рэдактараў на экскурсіі па Нацыянальным тэатры імя Янкі Купалы**




**Фотаздымак са спектакля “Двор майго дзяцінства”**

КЛУБ РЭДАКТАРАЎ ДЗЯРЖЫНСКАГА РАЁНА

## *Па патаемных мястэчках тэатра*

**Працаўнікі Купалаўскага тэатра з цеплынёй сустрэлі членаў клуба рэдактараў Дзяржынскага раёна ў сваім храме мастацтва.**

Жывыя зносіны з вялікімі людзьмі, якія прысвяцілі сябе тэатральным падмосткам – адбылася сустрэча з народнай артысткай Рэспублікі Беларусь Зінаідай Пятроўнай Зубковай, заслужанай артысткай Рэспублікі Беларусь, мастацкім кіраўніком Купалаўскага тэатра Вольгай Няфёдавай.

Закулісная прастора ахапіла ўдзельнікаў экскурсіі сваім чароўным абсталяваннем. Госці таэтра зазірнулі ў рэпетыцыйныя залы артыстаў, наведалі касцюмерны, грымёрны і рэквізітарскі цэхі.

Дзеці выказалі ўпэўненасць, што яшчэ не раз вярнуцца ў тэатр і працягнуць сваё падарожжа ў свет мастацтва.

НА РЭАЛЬНЫХ ПАДЗЕЯХ!

## Спектакль “Двор майго дзіцянства”

Пастаноўка – амаж рэжысёра Д. Філіповіча любімаму Мінску. Аўтар запрашае паглыбіцца ва ўспаміны аб светлай пары, калі дрэвы былі вялікімі, эмоцыі шчырымі, а ўсе людзі блізкімі!

ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»

# 2 КРАСАВІКА – ДЗЕНЬ ЯДНАННЯ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

САВЕНОК ГАННА,

8 КЛАС

**Адзіны урок, прысвечаны Дню яднання народаў Беларусі і Расіі.**

Дружба Беларусі і Расіі сёння моцная як ніколі. Больш за чвэрць стагоддзя дзве краіны, Беларусь і Расія, дэманструюць усяму свету прыклад згуртаванасці і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.



На мерапрыемстве прагучала інфармацыя пра гісторыю свята, мэты стварэння Саюза (імкненне павысіць узровень жыцця народаў, умацаваць супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй у розных галінах),




Навучэнцы вылучылі і раскрылі значэнні ключавых слоў, з дапамогай якіх можна скласці сучасны вобраз Саюзнай дзяржавы: агульная гісторыя і каштоўнасці, бяспека, адна мова, адсутнасць межаў, энергетыка, эканоміка, агульная адукацыйная прастора.

Рабяты зрабілі выснову: вельмі важна захаваць супрацоўніцтва і добрасуседскія адносіны з краінай-сястрой Расіяй, бо нас звязвае вялікая гісторыя і культура.







ГАЗЕТА «ПЕРАПЫНАК»



# Запалі сінім

## 2 КРАСАВІКА – СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ РАСПАЎСЮДЖВАННЯ ІНФАРМАЦЫІ АБ ПРАБЛЕМЕ АЎТЫЗМУ

ШАМКО МАКСІМ,

8 КЛАС

Нашы навучэнцы далучыліся да ўсяго свету і правялі мерапрыемствы ў знак салідарнасці да дзяцей з асаблівасцямі.

У песні спяваецца «паспрабуйце нас проста зразумець». Рабяты паспрабавалі зразумець дзяцей з такім захворваннем, даведацца бліжэй іх асаблівасці паводзін і зносін з людзьмі.

**“Дзеці дажджу” – так талерантна прынята называць дзяцей з аўтызмам.**



Было заўважана, што ў большасці сваёй такія дзеткі вельмі любяць глядзець на дождж – толькі без навальніцы, грому і маланкі.

У канцы мерапрыемства рабяты зрабілі выснову, што ўсе людзі на планеце Зямля розныя, у кожнага ёсць свае асаблівасці. І мы павінны паважаць індывідуальнасць іншага чалавека.

**Рознакаляровыя галаваломкі-пазлы** – сімвал аўтызму, ён з'яўляецца візітоўкай гэтага неўралагічнага парушэння.

Сімвал дапамагае стварыць дасведчанасць і падтрымліваць людзей у грамадстве.











**12 КРАСАВІКА – ДЗЕНЬ КАСМАНАЎТЫКІ, АБВЕШЧАНЫ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АСАМБЛЕЯЙ ААН.**

## Міжнародны Дзень выхаду чалавека ў космас

**ЛЕАНОВІЧ АЛЯКСАНДРА,**

**8 КЛАС**



*Хлапчук з палесскай вёскі*
*Лятаў на лыжах з горкі,*
*А ў сэрцайка запала*
*святло далёкай зоркі.*
*На караблі касмічным*
*збылася мара часам -*
*Лыжня крутая стала*
*Пачаткам зорнай трасы.*
М.Маляўка

# НАВІНЫ ДЗІЦЯЧАГА САДА

**Тэматычны тыдзень, прысвечаны Міжнароднаму дню выхаду чалавека ў космас.**

З мэтай фарміравання ў выхаванцаў цікавасці да дасягненняў нашай краіны ў галіне касмічных даследаванняў; выхавання пачуцця патрыятызму, гонару за дасягненні нашай краіны, павагі да людзей, якія прысвяцілі сваё жыццё заваяванню космасу; павагі да людзей, якія прысвяцілі сваё жыццё заваяванню космасу на працягу ўсяго тыдня ў дзіцячым садзе праводзіліся мерапрыемствы па гэтай тэме як у спецыяльна арганізаванай, так і ў нерэгламентыраванай дзейнасці.

Дзеці праглядалі прэзентацыі, малявалі, ляпілі і ўжывалі новыя веды ў гульнявой дзейнасці.







У шчаслівым жыцці няма месца наркотыкам
Прычыны наркаманіі падлетка:
❗ Недастатковая ступень гатоўнасці да навучання;
❗ Цяжкасці ў засваенні навучальных праграм;
❗ Адмова ад наведвання вучнем школы;
❗ Хранічныя захворванні і фізічная аслабленасць;
❗ Камунікатыўныя праблемы;
❗ Стрэс;
❗ Сямейныя праблемы;
❗ Сацыяльная неабароненасць
Беражыце сябе ад наркотыкаў!
НЕ СПРАБУЙЦЕ І НЕ ДАКРАНАЙЦЕСЯ!
Грычынская БШ